інтэграваны курс беларускай мовы і літаратурнага чытання. У 2004 годзе ў вучэбным працэсе сталі выкарыстоўвацца праграмы і комплексы інтэграваных вусных курсаў беларускай мовы (аўтары М. Г. Яленскі, Н. У. Антонава, Т. М. Шылько) у рускамоўнай школе і рускай мовы (аўтары М. Б. Анціпава, А. С. Грабчыкава) у беларускамоўнай школе. Аднак у змесце гэтых курсаў рэалізуюцца задачы навучання аўдзіраванню, чытанню, вуснам маўленню, а навучанне пісьмовай мове ў аспектах фарміравання арфаграфічных навыкаў і камунікатыўнай кампетэнцыі пераважнай большасці па-ранейшаму застаецца па-за межамі інтэграцыі. Акрамя таго, недастатковая ўвага надаецца фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі, якая разам з камунікатыўнай з'яўляецца адной з асноўных пры авалоданні беларускай мовай у школах з рускай мовай навучання.

*Літаратура*


1. Алтабаева, Е.В. Становление младшего школьника как языковой личности в процессе обучения русскому языку / Е.В. Алтабаева // Начальная школа. – 2005. – №10. – С. 35.
2. Яленскі, М. Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М. Г. Яленскі. – Мінск, НІА, 2002.


*І. М. Гоўзіч (Мінск, БДПУ)*

## ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА Ў ШКОЛЕ
## (да праблемы выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій)

Стан сучаснай літаратурнай адукацыі школьнікаў вызначаецца тым, што нават мінімальны аб'ём яе зместу вельмі значны і ўсё больш папаўняецца, а колькасць вучэбных гадзін, што адводзяцца на яго засваенне, практычна зведзена да мінімуму. У падобнай сітуацыі з-за дэфіцыту вучэбнага часу і складанасці матэрыялу трэба выпрацоўваць новыя адукацыйныя стратэгіі. Галоўнай задачай настаўніка становіцца не толькі тлумачэнне літаратурных твораў на ўроку, але і падрыхтоўка чытачоў да іх самастойнага ўспрымання, навучанне методыцы глыбокага і эфектыўнага чытання мастацкіх тэкстаў, выхаванне актыўнага, зацікаўленага чытача. Адукацыя на мяжы трэцяга тысячагоддзя павінна стаць магутным стымулам прагрэсіўных трансфармацый пры ўмове валодання выпускнікамі навучальных устаноў функцыянальнай пісьменнасцю і універсальнымі здольнасцямі: рабіць адказны і маральны выбар у складаных сітуацыях, вырашаць праблемы, адэкватна ацэньваць сітуацыю, прагназаваць і ставіць мэты ўласнай дзейнасці і інш. Гэтыя ўменні вучні атрымліваюць на вучэбных занятках, якія будуюцца на аснове прынцыпаў асобасна-арыентаваных адукацыйных тэхналогій.

У сучасных адукацыйных тэхналогіях найперш мяняецца погляд настаўніка на ролю вучня ў працэсе літаратурнай адукацыі: з аб'екта адукацыі ён ператвараецца ў суб'ект, калі істотнымі становяцца асобасныя ўяўленні і веды вучня. Настаўнік (як кіраўнік пазнавальнага працэсу) пры такім падыходзе выступае як пасрэднік паміж літаратурным творам і вучнем і не лічыць для сябе магчымым прымаць рашэнні за вучня. Па-другое, традыцыйныя тэхналогіі распрацоўваліся на аснове рэпрадуктыўна-інфармацыйнага падыходу, новыя – на аснове эўрыстычна-даследчага і праблемнага. Па трэцяе, выключнае значэнне пры падобным выкладанні надаецца алгарытмізацыі ўрока, распрацоўцы і прымяненню схем, табліц, картак, малюнкаў, што забяспечвае не толькі дыферэнцыяцыю вучэбнага матэрыялу (аналіз), але і сінтэз, яго цэласнае ўспрыманне. І нарэшце, новыя адукацыйныя тэхналогіі заснаваны на спалучэнні асобаснага і камунікатыўнага падыходаў.

Модульнае навучанне – арганізацыя вучэбнага працэсу, пры якой вучань працуе з матэрыялам, што складаецца з модуляў – сэнсава закончаных падтэм вялікай тэмы (блоку). Структуру зместу тэмы складаюць наступныя модулі: М 0 (нулявы модуль), які з'яўляецца ўводзінамі ў вывучэнне тэмы, вызначае мэты і задачы яе засваення; М 1 {2, 3, 4, 5...} 10 – вучэбныя модулі тэарэтычнага засваення тэмы; М R (модуль-рэзюме), які ўтрымлівае абагульненне дадзенай тэмы; М К (модуль кантролю) – забяспечвае выніковы ўзровень засваення ведаў і ўменняў. Настаўнік сам фармуе модуль, зыходзячы з матэрыялаў і патрабаванняў школьных праграм па беларускай літаратуры.

Пры вывучэнні творчасці Максіма Танка мы можам спраектаваць наступны модуль:

М 0. Максім Танк. Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці.

М 1. Лірыка Максіма Танка («Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ave Maria»). Шырокі творчы дыяпазон ранняй паэзіі. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей.

М 2. Паэма Максіма Танка «Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме. Блізкасць героя паэмы Танка да купалаўскага Гусляра.

М R. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Верлібр у творчасці мастака.

М К. Сачыненне-разважанне па творчасці Максіма Танка.

Адной з характэрных асаблівасцей модульнага навучання з'яўляецца рэйтынгавая ацэнка паспяховасці, пры якой на кожнага вучня заводзіцца тэхналагічная карта вывучэння модуля, якая стымулюе актыўную працу вучняў, іх імкненне да лепшых вынікаў:

Пытанні і заданні настаўніка павінны адпавядаць наступным узроўням:

I узровень (нізкі (рэцэптыўны)) – пазнаванне, для якога характэрныя наступныя пытанні: Што адбываецца ў творы? Хто з'яўляецца галоўнымі героямі твора?

II узровень (здавальняючы (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны)) – неўсвядомленае аднаўленне: Калі і дзе адбываюцца падзеі? Якая тэма, ідэя твора?

III узровень (сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны)) – аднаўленне на ўзроўні разумення: Як вы ацэньваеце падзеі, адлюстраваныя ў творы? Абгрунтуйце паводзіны і ўчынкі герояў.

IV узровень (дастатковы (прадуктыўны)) – прымяненне ведаў і ўменняў у знаёмай сітуацыі: Якая аўтарская пазіцыя? Як яна выяўляецца?

IV узровень (высокі (прадуктыўны, творчы, асэнсавана-аналітычны)) – прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай сітуацыі (творчы перанос): Праз якія мастацкія сродкі раскрываецца аўтарская пазіцыя, ідэя твора, ствараюцца характары?

Навучанне на аснове модульнай тэхналогіі спрыяе не толькі асэнсаванаму засваенню матэрыялу, разуменню прычынна-выніковых сувязей, але і фарміруе культуру самастойнай працы школьнікаў.

*Літаратура*

1. Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання. Беларуская літаратура. V–X класы, базавы і павышаны

ўзроўні: IX–X класы, паглыблены ўзровень: XI–XII класы, базавы і павышаны ўзроўні: XI–XII класы, паглыблены ўзровень / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск: Аверсэв, 2007. – 304 с.
2. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии / Н. И. Запрудский. – Минск: Сэр-Віт, 2006. – 288 с.

*С. В. Дамброўская (Мінск, МДІПК)*

## АНАЛІЗ ЭПІЧНАГА ТВОРА НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ Ў V КЛАСЕ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

На ўроках літаратуры вялікая роля надаецца выхаванню асобы. Адна з асаблівасцей літаратурнага навучання заключаецца ў тым, што ўвесь ход працы настаўніка накіраваны на развіццё маўлення вучняў і, як вынік, мыслення. Развіццё звязнага маўлення вучняў пастаянна ажыццяўляецца на ўроках літаратуры і знаходзіцца ў непарыўным адзінстве з аналізам мастацкага твора. На пачатковым этапе навучання вучняў звязнаму маўленню пажадана браць для аналізу невялікія па памеры, зразумелыя па змесце апавяданні.

Адным з найбольш дзейсных камунікатыўных прыёмаў, якія спрыяюць развіццю звязнага маўлення вучняў, з'яўляецца, на нашу думку, абмеркаванне праблемных пытанняў пры аналізе мастацкага твора. С. А. Лявонаў адзначае, што «...засваенне мовы і маўлення найбольш эфектыўна адбываецца ў працэсе зносін» [2, с. 22].

Напрыклад, пры вывучэнні ў V класе казкі Уладзіміра Караткевіча «Нямоглы бацька» для абмеркавання вучням можна прапанаваць наступныя пытанні: Чаму людзі (нават разумеючы, што Закон дрэнны, няправільны) падпарадкоўваліся яму? Чаму пісьменнік сцвярджае, што «*сіроцкая сляза мацнейшая за ўсё*»? Як вы разумееце словы: «*Зніўчалі «ўчора» і таму не мелі права на «заўтра»*»?

Аднак, як паказвае практыка, перанасычанасць урока пытаннямі не заўсёды спрыяе раскрыццю творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу школьнікаў. Каб пазбегнуць гэтага, мэтазгодна арганізоўваць групавую працу вучняў (кожная група атрымлівае па адным пытанні).

«Працэс зносін патрабуе такога кантакту з іншымі людзьмі, пры якім суб'ект бачыць у іх сабе роўных і таму разлічвае на зваротную сувязь, на абмен інфармацыяй, а не на аднабаковае яе ажыццяўленне» [2, с. 22–23]. Менавіта таму вельмі важна пры арганізацыі групавой формы працы стварыць такія ўмовы, якія б спрыялі свабоднаму абмену думкамі і інфармацыяй паміж удзельнікамі групы.

Пасля абмеркавання пытанняў у групах вучні выказваюць свой пункт гледжання на сфармуляваную ў пытанні праблему. Вельмі важна, каб у абмеркаванні прымаў удзел увесь клас. Аптымальны варыянт – стварэнне на ўроку дыскусійнай атмасферы.

Напрыклад, пры вывучэнні ў V класе апавядання Анатоля Кудраўца «Цітаўкі», прытрымліваючыся дыдактычнага прынцыпу: ад простага да складанага, варта прапанаваць вучням наступныя заданні:

1. Складанне цытатнага плана апавядання.
2. Работа ў групах: кожная група знаходзіць у прапанаваных настаўнікам частках плана (па адной кожнай групе) апісанні герояў ці прадметаў і рыхтуе іх выразнае чытанне.
3. Абмеркаванне праблемных пытанняў.
4. Аналітычная гутарка па творы.